УДК 94 (476)

*С.П. Стрэнкоўскі*

## ПРЫВІЛЕІ БЯРЭСЦЯ ЯК ПРАВАВАЯ АСНОВА ЯГО САМАКІРАВАННЯ Ў XIV–XVIII стст.

У артыкуле аналізуюцца прывілеі, атрыманыя Брэстам на працягу існавання ў ім самакіравання, заснаванага на магдэбургскім праве. Выкарыстаны граматы, якія апублікаваныя ў друкаваных зборніках, і тыя, што знаходзяцца ў кнігах Метрыкі ВКЛ. Зроблены высновы аб тым, што прывілей на магдэбургскае права Брэсту 1390 года з’яўляецца пачатковым момантам у станаўленні традыцыі гарадскога права ВКЛ. У ім быў замацаваны шэраг палажэнняў, якія ў далейшым сталі падставай для фундацыйных прывілеяў іншым гарадам Беларусі. Адсутнасць у ім разгляду цэлага шэрагу пытанняў функцыянавання гарадскога самакіравання дала падставу для далейшага выкарыстання ў гарадскім праве вуснай традыцыі і звычаёвага права. Вопыт, які такім чынам назапашваўся, далей знаходзіў адлюстраванне на старонках прывілеяў іншым гарадскім паселішчам. Абшчына самастойна выпрацоўвала нормы, якія датычыліся наменклатуры, колькасці і парадку выбараў службовых асоб самакіравання.

### Уводзіны

Апошняя чвэрць XIV ст. для ВКЛ – гэта кропка біфуркацыі, калі пад уздзеяннем пагрозы, якая зыходзіла ад Тэўтонскага ордэна, названая дзяржава пайшла на аб’яднанне з Польшчай. Гэта абумовіла паступовае запазычанне структур улады і кіравання, якія былі ўласцівы для Польшчы. Такой дастаткова стэрэатыпнай для Польшчы XIV ст. формай гарадскога самакіравання было магдэбургскае права. Пры гэтым неабходна пагадзіцца з Ю. Бардахам, які лічыў распаўсюджанне магдэбургскага права ў ВКЛ часткаю ўсеагульнага цэнтральна- і ўсходнееўрапейскага працэсу рэцэпцыі нямецкага права [1, с. 24, 33]. Рэцэпцыя гэтая аблягчалася пэўным падабенствам магдэбургскага права і славянскіх звычаяў, якое падкрэсліваў у свой час В.А. Мацяёўскі [2]. Сёння гэтая думка праводзіцца А.Л. Рагачэўскім [3, с. 21–22].

Відавочна, што падараванне Вільни і Бярэсцю магдэбургскага права можна разглядаць і як вынік дзеяння ў гісторыі т.зв. QWERTY-эфектаў, бо Ягайлам быў выкарыстаны першы, ляжачы на паверхні ўзор гарадскога права, хоць у наяўнасці былі і больш распрацаваныя яго варыянты (напрыклад, хэлмінскае). Па меркаванні У.І. Пічэты, перш за ўсё магдэбургскае права давалі «вузлавым» гарадам (Бярэсце – «мост» паміж Польшчай і ВКЛ) [4, с. 426]. Пэўную ролю тут адыграла і барацьба Ягайлы з Вітаўтам, на што звяртаў увагу Р. Баравы [5].

Вывучэнне менавіта берасцейскага комплекса прывілеяў з’яўляецца актуальным, бо ў ім бярэ пачатак гарадское права ВКЛ. Разам з тым менавіта як пэўны комплекс берасцейскія прывілеі XIV–XVIII стст. не даследаваліся ні ў айчыннай, ні ў замежнай гістарыяграфіі. Спецыяльнае даследаванне гісторыі Бярэсця Т. Забэлы абмяжоўвалася толькі XVI ст., і вялікую ўвагу аўтар надаваў сацыяльна-эканамічнаму развіццю горада [6]. У працах жа В.Д. Дружчыца [7; 8] і З.Ю. Капыскага [9] берасцейскія прывілеі даследаваліся разам з граматамі іншых паселішчаў і таксама датычыліся XVI і XVII стст.

Задачамі нашага даследавання з’яўляюцца храналагічнае выкладанне прывілеяў, атрыманых горадам на працягу яго магдэбургскай гісторыі, выяўленне грамат гораду, якія змешчаны ў друкаваных крыніцах і Метрыцы ВКЛ, і іх аналіз. Таксама неабходна параўнаць нормы прывілеяў з рэальнымі мерапрыемствамі ў галіне самакіравання, якія адбываліся ў горадзе ў разглядаемы час. Для гэтага намі выкарыстоўваліся як агульнанавуковыя метады (лагічны метад, аналіз, сінтэз, абагульненне), так і спецыяльна-гістарычныя метады (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны).

**Фундацыйныя прывілеі на магдэбургскае права**

Як ужо адзначалася вышэй, пачатак магдэбургскаму самакіраванню Бярэсця паклаў прывілей Ягайлы 1390 г., хоць самі па сабе нормы магдэбургскага права ў гэтай грамаце адсутнічаюць. Яго дыспазіцыя ўтрымлівае палажэнні аб пераводзе Бярэсця з «рускага» на магдэбургскае права; аб вызваленні берасцейскіх мяшчан ад усіх іншых правоў і звычаяў, якія парушаюць апошняе, ад «усялякага суда і ўлады» ўсіх дзяржаўных службовых асоб; аб увядзенні суда войта, у тым ліку па крымінальных справах; аб падсуднасці войта толькі суду вялікага князя па магдэбургскім праве ў выпадку, калі яго выклікаюць спецыяльным лістом з асабістай пячаткай вялікага князя; аб надзяленні Бярэсця 60 ланамі зямлі і выплаце з яе чынша на дзень святога Марціна [10, с. 189–190]. У адрозненне ад віленскага прывілея 1387 г. тут утрымліваецца згадка аб вызваленні мяшчан ад улады службоўцаў дзяржавы. З другога боку, зусім адсутнічае парадак прызначэння войта і ўпамінанне аб іншых службовых асобах, парадак збору падаткаў. Відавочна, што гэтыя пытанні рэгуляваліся вуснай традыцыяй. Таксама адзначалася, што войт мае права ў крымінальных справах ажыццяўляць правасуддзе «па звычаю зямлі», абапіраючыся пры гэтым на «права нямецкае». Прычым абсяг яго ўладных паўнамоцтваў якраз і ляжыць у плоскасці судовай дзейнасці: судзіць, вырашаць справы, асуджаць і караць вінаватых. Напэўна, тут, як і ў граматах іншых гарадоў ВКЛ, такое падрабязнае апісанне правамоцтваў войта звязана з тым, што ў магдэбургскім праве не войт, а бургграф быў найвышэйшай судовай інстанцыяй у горадзе.

Амаль аднолькавы змест мае грамата на магдэбургскае права, якая дадзена Бярэсцю Вітаўтам 25.01.1408 г. [11, с. 3–5]. Яна адрасавана ўсім жыхарам горада: «немцам і палякам і ўсіх нацый людзям, якія належаць хрысціянскай веры і рэлігіі каталіцкай, як немцы і літоўцы, і ўсім схізматыкам неафітам». Пры гэтым дзеянне магдэбургскага права не распаўсюджваецца на русінаў-праваслаўных. Вітаўт дае ў поўнае валоданне Бярэсцю вёску Казловічы, што паклала пачатак наяўнасці ва ўласнасці магдэбургскіх гарадоў ВКЛ вёсак, засценкаў, фальваркаў як агульнагарадской уласнасці. Менавіта такія сельскія паселішчы ў ВКЛ карысталіся нямецкім правам у адрозненне ад той жа Польшчы, дзе яго мела вялікая колькасць вёсак. У якасці прыкладу Бярэсцю вялікі князь прыводзіць Люблін, што ў далейшым выклікае, у прыватнасці, запазычанне люблінскіх нормаў берасцейскімі цэхамі.

Бярэсце атрымала прывілей на магдэбургскае права ад Казіміра Ягелончыка ў 1440 г. [11, с. 16–18]. Прывілей датычыўся жыхароў усіх нацый і веравызнанняў, паўтараў змест папярэдніх, аднак разам з войтам прыгадваў радцаў. Гэтыя прывілеі трэба разглядаць у комплексе, бо яны не пацвярджальныя, а раўназначныя.

28.07.1495 г. грамату, якая адначасова датычылася горада і разам з тым прызначала новага войта, выдаў вялікі князь Аляксандр. Пацвярджаючы гораду магдэбургскае права, гаспадар растлумачыў парадак выбараў бурмістраў. Штогод войт з выбраных радцаў павінен быў вызначыць і канфірмаваць 2 бурмістраў [12, с. 26–28]. У 1505 г. ў суботу перад Вербнай нядзеляй Аляксандр яшчэ раз пацвердзіў Бярэсцю магдэбургскае права [13, арк. 79–90].

**Ільготныя і пацвярджальныя прывілеі XVI–XVIII стст.**

Вялікі князь Жыгімонт Стары 20.09.1511 г. пацвердзіў берасцейскім мяшчанам магчымасць збіраць у гарадскую скарбонку даходы ад мераў збожжа, мёду, гандлёвых і хлебных сталкоў, мядовых, піўных і вінных гандляў, гандлю гарэлкай на ратушы, мясных ятак, крамаў, пастрыгальні, васкабойні. Было дазволена пабудаваць гарадскую лазню з прыбыткам на ратушу. Уводзілася 3 кірмашы: на актаву Трох Каралёў, дзень святога Войцеха, дзень святога Баўтрамея. Усё гэта закладвала фінансавую аснову гарадскога самакіравання. Старасту забаранялася судзіць мяшчан і кіраваць імі. Духоўныя і свец-

кія падданыя, якія займаліся рамяством і гандлем, павінны былі супольна з іншымі мяшчанамі плаціць серабшчыну, напраўляць паромы і масціць масты падчас прыезду вялікага князя і праваднікоў. Пад «знакамітага чалавека» мяшчане павінны былі даваць не болей за две падводы і двух праваднікоў [14, с. 93–95; 15, с. 87–88; 16, с. 455–457; 13, арк. 79–90]. Канфірмацыйны прывілей Жыгімонт Стары выдаў і ў 1520 г. [13, арк. 79–90].

Як бачым, берасцейскія мяшчане шырока выкарыстоўвалі магчымасць звяртання да вялікага князя з мэтай рэгулявання падатковых і павіннасных адносін, упарадкавання гарадскога скарбу. Гэтая практыка працягвалася і далей. Жыгімонт Стары 05.05.1525 г. вызваліў мяшчан Бярэсця ад дачы падвод і праваднікоў паслам, а пакідаў такі абавязак толькі ў дачыненні да тых, хто будзе мець лісты з уласным подпісам вялікага князя [17, с. 376–377]. Ён жа 23.06 1525 г. вызваліў берасцейскіх мяшчан ад дачы шасці коней на прыезд вялікага князя, даў ім права збіраць маставое мыта на Мухаўцы, Угрынцы і Струзе па паўгроша ад купецкага воза, ад купецкага каня па 2 пенязі, ад буйной жывёлы па пенязю, ад пяці дробных жывёл таксама па пенязю. За гэтыя грошы мяшчане павінны былі рамантаваць адпаведныя масты, а таксама набываць зброю. Абавязак рамантаваць паркан ускладаўся як на мяшчан магістрацкай юрысдыкцыі, так і на княжацкіх, панскіх і духоўных мяшчан [17, с. 388–389].

Жыгімонт Аўгуст 21.11.1551 г. выдаў гораду прывілей, якім перадаў на карысць абшчыны чынш з 60 гарадскіх ланаў зямлі [18, арк. 58адв.–60]. За гэта горад павінен быў справіць гадзіннік і трымаць трубача, а таксама забяспечыцца «речми бронными для беспечнейшого мешканья». Таксама кароль вызваліў магдэбургскую абшчыну ад падводнай павіннасці.

Генрых Валуа 10.04.1574 г. пацвердзіў Бярэсцю прывілеі на магдэбургскае права вялікіх князёў Ягайлы, Вітаўта, Казіміра, канфірмацыйныя прывілеі вялікіх князёў Аляксандра 1505 г., Жыгімонта І 1520 г., Жыгімонта Аўгуста. Дадзеная грамата не ўносіла ніякіх змен і не ўтрымлівала дапаўненняў [19, арк. 22–24адв.].

У час міжкаралеўя мяшчане Бярэсця атрымалі прывілей ад паноў-рады ВКЛ, які дазволіў ім набываць солад для вырабу піва «на стороне за местом», а таксама ў сваіх броварах варыць піва і сыціць мёд і гандляваць імі, не даючы ў каралеўскі скарб ніякіх падаткаў і капшчыны [20, арк. 154–154адв.]. Ён быў пацверджаны 30.05.1579 г. У гэ-ты ж дзень берасцейскія мяшчане атрымалі права браць маставое ад кожнага купецкага каня па 1 пенязю на гарадскі прыбытак [20, арк. 152адв.–153адв.].

Стэфан Баторый прывілеем ад 03.01.1580 г. дазволіў берасцейскім мяшчанам спаганяць «на ратуш» з купцоў маставое мыта па 2 пенязі з воза, у які запрэжаны 1 ці 2 кані, і па 4 пенязі з воза, запрэжанага 4 канямі, па прычыне вялікіх выдаткаў на рамонт мастоў на рэках, а таксама на брукаванне горада [21, арк. 2–3].

Жыгімонт Ваза па просьбе мяшчан Бярэсця павялічыў памер маставога мыта да 4 пенязяў ад кожнага каня, нягледзячы на колькасць запрэжаных у воз коней. Маставое не спаганялася толькі са шляхты і іх падвод. Немагдэбургскія мяшчане, якія не жадалі ўдзельнічаць у рамонце мастоў, павінны былі выплачваць мыта, як купцы з іншых гарадоў. Прывілей датаваны 13.03.1595 г. Гандлярам, якія прыязджалі ў Бярэсце, не дазвалялася гандляваць збожжам і іншымі прадуктамі харчавання на прадмесцях і па вуліцах. Прычым падданыя немагдэбургскіх юрыдык і перакупнікі з іншых гарадоў не маглі набываць тавары, «покул знак местский на ратушу вывешон будеть» [22, арк. 313адв.–315]. Прывілеем ад 07.05.1596 г. Жыгімонт ІІІ вызваліў Бярэсце ад старога мыта ад усялякіх тавараў на берасцейскай каморы, спасылаючыся на грамату Вітаўта, якая згарэла ў ліку іншых разам са скрынкай месцкай у доме райцы Андрэя Слупскага ў час пажару рынка 15.11.1595 г. Грамата датычылася як магдэбургскай абшчыны, так і яўрэяў [23, арк. 81адв.–82адв.]. 18.06.1607 г. кароль дазволіў Бярэсцю праводзіць кірмашы на Дзень Святога Лукі Евангеліста, Дзень Святой Агнэты, Узнясенне Пана

[24, арк. 48–49]. Граматай 28.02.1631 г. Жыгімонт Ваза канфірмаваў мяшчанам устанаўленне маставога памерам у 2 шэлягі ад фурманскіх вазоў і купцоў, за выключэннем «стана духовного и шляхты» [25, арк. 469–469адв.]. 16.08.1631 г. Жыгімонт III пацвердзіў прывілеі на магдэбургскае права Ягайлы, Вітаўта, Казіміра, канфірмацыйныя прывілеі Аляксандра 1505 г., Жыгімонта Старога 1511 і 1520 гг., Жыгімонта Аўгуста 1551 г., Стэфана Баторыя 21.12.1576 г. Грамата ўключала поўныя тэксты названых прывілеяў, агаворвала права свабоднай элекцыі службоўцаў горада цэхмістрамі і абшчынай, а таксама прысягу ландвойта (viceadvocatus) [13, арк. 79–90]. Менавіта гэты прывілей нарматыўна падмацоўваў звычай, які ўжо бытаваў у горадзе раней, аб чым сведчаць элекцыйныя акты (напрыклад, 1589 г. [9, с. 103], 1625 і 1626 гг. [26, арк. 481, 600], 1650 г. [27, арк. 336]). З актаў відаць, што выбары ў Бярэсці адбываліся на Серадапосце. Абшчына самастойна вызначала аплату працы сваіх службоўцаў. Так, у апошнім з прыведзеных выпадкаў пісару Базылю Раповічу прызначалася штогадовая «пенсія» ў 10 коп літоўскіх грошаў.

Прыгаданую грамату Жыгімонта III пацвярджае яго ж ліст да дзедзічнага войта Бярэсця Казіміра Тышкевіча 16.04.1632 г. [28, арк. 109–109адв.]. Кароль загадаў войту прынесці ў ратушы прысягу па нормах Juris Maydeburgensis і прытрымлівацца іх у сваёй дзейнасці. Прысяглага ландвойта войт павінен быў прызначыць са складу магістрата. Суды па крымінальных і «вялікіх» правах ён павінен быў ажыццяўляць згодна з правіламі juditium compositam разам з усім складам магістрата ў ратушы. Таксама і іншыя справы войту прадпісвалася разглядаць разам з лаўнікамі ў ратушы. Асабіста і ў сваім доме войт мог судзіць толькі тыя справы, якія не перавышалі 10 коп грошаў, што ўскосна адпавядае віленскаму судоваму вількеру. Членаў магістрата войт мог судзіць толькі разам з усім яго складам. Прадпісвалася не забараняць апеляцыі да караля і задворнага суда. Падаткі дазвалялася збіраць магістрату і перадаваць не войту, а адразу да паборцаў. Войт не павінен быў спаганяць віну ў памеры большым, чым вызначалі нормы магдэбургскага права (на практыцы, відаць, «Уставы выплат» Б. Граіцкага) і прывілеі горада. Гэты ліст пацвердзіў 15.02.1633 г. новы кароль Уладзіслаў IV.

Граматай ад 19.02.1633 г. Уладзіслаў ізноў пацвердзіў магдэбургскія прывілеі Бярэсця. У грамаце гаворыцца, што прывілеі, напісаныя на пергаменце лацінскай мовай, былі «у адной кнізе змешчаныя» [28, арк. 79–80]. Такім чынам, можна меркаваць аб наяўнасці ў Бярэсці такой жа кнігі прывілеяў, як у Вільні, Віцебску, Гародні.

Уладзіслаў IV асобна агаворвае некаторыя гарадскія парадкі. Так, бурмістры і шафары павінны былі штогод на Серадапосце рабіць «лічбу» перад васьмю дэпутатамі, абранымі паспольствам. Прычым войт і ландвойт умешвацца ў гэта не маглі. Пацвярджаецца выкананне гэтай пастановы запісам у актавай кнізе ад 11.03.1637 г., калі былі выбраныя 8 дэпутатаў «для слухання лічбы»: па 2 ад рынку і ад вуліц Замухавецкай, Заўбрынецкай, Пясецкай [29, с. 15]. Шафараў у горадзе штогод выбіралі два: адзін загадваў прыбыткамі, а другі – выдаткамі [29, с. 602]. Увесь горад на год выбіраў шпітальных апекуноў, якія адказвалі за ўтрыманне «рускага шпіталя» і штогод рабілі справаздачу [29, с. 793].

Па грамаце Уладзіслава войт павінен быў прызначаць ландвойтам аседлага мяшчаніна з ліку магістрата. Войту і ландвойту забаранялася судзіць разам з лаўнікамі бурмістраў і райцаў. Такі суд мог адбывацца толькі на супольным пасяджэнні лавы і рады. Войт не мог забараняць апеляцыю да каралеўскага суда, для чаго павінен быў выдавацца выпіс з гарадскіх кніг з войтаўскай і радзецкай пячаткамі. Войту і ландвойту забаранялася «свавольна і бяспраўна» абцяжарваць берасцейскіх мяшчан вінамі. Рабіць гэта можна было толькі па рашэнні рады. Суды прадпісвалася адпраўляць згодна «Саксоне права Майдэбургскага». Мяркуючы па актавых кнігах магістрата, у Бярэсці карысталіся лацінскамоўнымі выданнямі М. Яскера, польскамоўнымі «Парадкам судоў»,

«Артыкуламі» і «Учынкам» Б. Граіцкага, а таксама «Саксонам» П. Шчэрбіча. Ландвойт, лаўнікі і іншыя мяшчане, якія называлі сябе войтаўскімі слугамі, а жылі на магдэбургскіх землях, павінны былі несці ўсе гарадскія падаткі і павіннасці нароўні з магдэбургскімі мяшчанамі. Гэта датычылася таксама яўрэяў, якія жылі на гарадскіх плацах [28, арк. 80–80адв.].

Апошні вядомы канфірмацыйны прывілей Бярэсцю выдаў Аўгуст III 20.11.1744 г. [31, с. 547–550]. Грамата ўскосна пацвярджае існаванне ў XVIII ст. традыцыі выбрання бурмістрамі па адной асобе «рымскага» і «грэчаскага» спавядання (у дадзеным выпадку Павел Сегяневіч і Дзям'ян Татарыновіч). У ёй прыгаданы два прывілеі папярэднікаў гэтага караля. Ян Казімір 27.07.1661 г. вызваліў горад ад усіх «цяжараў ваенных» (ізноў жа прыгаданы бурмістры – католік і «рускі»: Габрыэль Раманоўскі і Раман Матфіевіч). Кароль забараніў ландвойту ўмешвацца ў суд бурмістраў і радцаў, за выключэннем крымінальных спраў. Яму забаранялася сведчыць акты на землі і іншыя «вечнасці». Берасцейскія суды павінны былі кіравацца «плебісцытам Віленскім». Апеляцыя ад дэкрэтаў бурмістроўска-радзецкага суда павінна была накіроўвацца адразу да караля, а не да войта. Тым, хто абражаў на сесіі ўрад словамі, пагражала закаванне ў «куну». Дамы магістрацкіх асоб вызваляліся ад пастояў. Усе хрысціяне, яўрэі і татары, якія жылі ў горадзе і займаліся гандлем і рамяством, павінны былі падначальвацца і судзіцца ў магістраце і несці ўсе павіннасці разам з магдэбургскай абшчынай. Гораду перадаваліся кадуковыя маёмасці, на якія не было прэтэндэнтаў на працягу 3 гадоў. Граматай ад 1672 г. прывілей Яна Казіміра пацвердзіў Міхал Вішнявецкі. У актавым запісе берасцейскага магістрата за 1726 г. прыгадваюцца таксама прывілеі Яна III і Аўгуста II, «каб людзі розныя, якія жывуць на землях панскіх, духоўных, кляштарных і маюць заробак з занятку рамяством у горадзе, аддаўшы пану штогадовы чынш, усе павіннасці, якія належаць гораду, выконвалі і судам войта і яго намесніка падлягалі» [40, с. 389].

**Заключэнне**

Такім чынам, можна сцвярджаць, што прывілей Бярэсцю 1390 г. на магдэбургскае права з'яўляецца пачатковым момантам у станаўленні традыцый гарадскога права ВКЛ. У ім быў замацаваны шэраг палажэнняў, якія ў далейшым сталі асновай для фундацыйных прывілеяў іншым гарадам Беларусі. Акрамя таго, нераспрацаванасць у ім многіх пытанняў функцыянавання гарадскога самакіравання стварала падставу для далейшага выкарыстання вуснай традыцыі і звычаёвага права. Вопыт, які назапашваўся, знаходзіў адлюстраванне на старонках прывілеяў іншых гарадскіх паселішчаў ВКЛ. Мяшчане Бярэсця актыўна ўдзельнічалі ў дзейнасці самакіравання горада. Можна канстатаваць, што менавіта абшчына вызначыла тую колькасць бурмістраў, радцаў і лаўнікаў, якая існавала ў горадзе на працягу магдэбургскага перыяду. У далейшым грамадою былі створаны такія дадатковыя пасады гарадскога самакіравання, як шафары, дэпутаты і шпітальныя апекуны, існаванне якіх было замацавана каралеўскімі прывілеямі. Парадак жа іх абрання быў вызначаны самімі мяшчанамі. Мяшчане Бярэсця звярталіся да гаспадароў па ільготныя і імунітэтныя прывілеі, якія стваралі фінансавы падмурак самакіравання. Усе нададзеныя гораду прывілеі рэалізоўваліся на практыцы, былі прававымі падставамі для існавання і дзейнасці органаў самакіравання, прыняцця імі рашэнняў па канкрэтных справах жыхароў горада і яго ваколіц.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Bardach, J. Miasta na prawie magdeburskim w Wielkim Księstwie Litewskim od schyłku XIV do połowy XVII wieku / J. Bardach // Kwartalnik historyczny. – R. 87. – № 1. – Warszawa, 1980.

2. Macejowski, W.A. Historia miast i mieszczan w kraiach dawnego państwa polskiego od czasów najdawnejszych aż do połowy XIX w. / W.A. Macejowski // Roczniki towarzystwa przyjaciół nauk. – Poznań, 1890. – t. XVII. – Z. 2.

3. Рогачевский, А.Л. Меч Роланда. Правовые взгляды немецких горожан XIII–XVII вв. / С.-Петерб. гос. ун-т. – СПб. : Изд-во С.-Петерб. ун-та, 1996. – 153 с.

4. Пичета, В.И. Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве / В.И. Пичета. – М. : Изд-во АН СССР, 1958. – 547 с.

5. Баравы, Р. Атрыманне магдэбургскага права Берасьцем і палітычная барацьба ў Вялікім княстве Літоўскім на мяжы XIV–XV стст. / Р. Баравы // Беларус. гіст. агляд. – Т. 1, сш. 1. – Мінск, 1994. – С. 38–53.

6. Забэла, Т. Места Берасцейскае ў XVI ст. / Т. Забэла // Запіскі аддзелу гуманітарных навук. Кн. 8. Працы клясы гісторыі. – Менск, 1929. – Т. III. – С. 83–109.

7. Дружчыц, В.Д. Войты і іх улада ў беларускіх месцах з магдэбургскім правам / В.Д. Дружчыц ; Інбелкульт. – Мінск, 1928. – 58 с.

8. Дружчыц, В.Д. Магістрат у беларускіх местах з магдэбургскім правам у XV–XVII стагоддзях / В.Д. Дружчыц. – Мінск : Друкарня Беларус. акад. навук. – 31 с.

9. Копысский, З.Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII вв. / Акад. наук БССР, Ин-т истории. – Минск : Наука и техника, 1975. – 191 с.

10. Стрэнкоўскі, С.П. Прывілеі і вольнасці беларускіх гарадоў з нямецкім правам у канцы XIV – канцы XVIII стагоддзя : манаграфія / С.П. Стрэнкоўскі. – Мінск : МГІРА, 2008. – 251 с.

11. Акты Литовско-Русского государства / изд. М.В. Довнар-Запольским.– М. : Универ. тип., 1899. – XII, Вып. 1. – 258 с.

12. Собрание государственных и частных актов, касающихся истории Литвы и соединённых с ней владений / под ред. М. Круковича. – Вильна, 1858. – VIII, 164 с.

13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 104. Прывілеі і іншыя акты.

14. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. Т. 2. – СПб, 1848. – 437 с.

15. Lietuvos Metrika. Knyga № 9 (1511–1518) / Parengė K. Pietkiewicz. – Vilnius : Zara, 2002. – 615 p.

16. Lietuvos Metrika. Knyga № 8 (1499–1514) / Parengė A. Baliulis, R. Firkovičius, D. Antonavičius. – Vilnius, 1995. – 708 p.

17. Lietuvos Metrika. Knyga № 12 (1522–1529). – Vilnius : Zara, 2001. – 854 p.

18. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 35. Метрыка прывілеяў, данін, пацвярджэнняў.

19. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 57. Прывілеі, пажалаванні, пацвярджэнні.

20. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 64. Метрыка караля Стэфана.

21. НГАБ. Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 66. Прывілеі, пажалаванні, пацвярджэнні.

22. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 78. Прывілеі і пажалаванні.

23. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 83. Прывілеі, пацвярджэнні і пажалаванні.

24. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 89. Прывілеі, пажалаванні, пацвярджэнні.

25. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 99. Прывілеі на розныя пасады, старосты, арэнды.

26. НГАБ. – Фонд 1786. – Воп. 1. – Спр. 1. Актавая кніга брэсцкага магістрата 05.10.1623 – 01.10.1626.

27. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 123. Прывілеі, пажалаванні, пацвярджэнні.

28. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 106. Прывілеі, пажалаванні і дэкрэты Уладзіслава IV.

29. НГАБ. – Фонд 1786. – Воп. 1. – Спр. 2. Кніга брэсцкага магістрата 19.01.1637 – 30.12.1641.

30. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 173. Кніга меншай канцылярыі.

31. НГАБ. – Фонд 1786. – Воп. 1. – Спр. 5. Кніга актаў магдэбургскіх брэсцкіх ад 1708 да 1739 года.

**_Strenkovski S_. Brest Privileges as a Legal Basis of Self-Government in the 16-18th Centuries**

In this article the author analyzes the privileges received by Brest during the existence of self-government, based on Magdeburg rights. Certificates previously published in the printed collections, and the Metric books of the Grand Duchy of Lithuania were also used by the author. Conclusions are made about the fact that the privilege of the Magdeburg right given to Brest in 1390 is the starting point in the development of the town law traditions in the Grand Duchy of Lithuania. That privilege fixed a number of provisions, which later became the basis for fundamental privileges of other Belarusian cities. The lack of taking into consideration a number of issues related to city self-government functioning created the basis for further use of oral tradition and customary law. Accumulated experience was further reflected on the pages of other urban settlements privileges. The community itself developed standards concerning the nomenclature, the number and the elective order of the self-government officials.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 18.10.2011